Кошт паштовай перасылкі аплачана агулам.

Цана асобнага нумару 3000 м. п.

ВОЛЬНЫ СЬЦЯГ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 36.000 м. п.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 7000 мк., сярод тэксту 6000 м. і на 4 стр. 5000 м., за радок пэтыту у 1 шпальт.

№ 8. Вільня, Аўторак, 11-га верасьня 1923 г. Год I.

Чырвоны „культуркампф“.

Некалі, ў часе істнаваньня вялізарнае Расейскае Імпэрыі, злучаўшае дзесяткі розных нацыянальнасьцяў, розных моваў і розных культур, вырастаўшых ў мінуўшчыне ў самых размавітых абставінах, — прадстаўнікі расейскага соцыялізму, шчырыя барацьбісты *за волю для ўсіх*, ніяк не маглі зразумець, чаму гэтая воля ў разуменьні „інародцаў“ ня можа зьмясьціцца ў межах „ўсерасейшчыны“, на ўлоньні „дабрадзейнае“ расейскае культуры. Асабліва варожа да нацыянальных імкненьняў „інародцаў“, да іх жаданьня культурна-нацыянальнае і палітычнае самастойнасьці адносілася, як гэта ні дзіўна, расейская соцыял-дэмакратыя: яна бачыла ў-ва ўсім гэтым выяўленьне „дробна-буржуазнае“ ідэолёгіі, нязгоднае з соцыялізмам. І толькі ў самым апошнім часе соцыялістычная Расея выраклася старых пaглядаў соц.-дэмакратыі на нацыянальнае пытаньне і як-раз *нацыянальны прынцып* палажыла ў аснову дзяржаўнага будаўніцтва Саюза Соцыялістычных Радавых Рэспублік.

Пагляды старых расейскіх соцыялістычных дзеячоў грунтаваліся на тэй праўдзе, якую ў двух радках высказаў выдатны беларускі пролетарскі поэт, Міхась Чарот, ў сваей поэме „Босыя на вогнішчы“:

Хто рэжа—таму не балюча,
Баліць тым, каго рэжуць.

Вось-жа ў старой Расеі „рэзалі“ інародцаў, а „рэзаў“ іх ня толькі адміністрацыйны апарат, ня толькі дзяржава, але і расейскае грамадзянства, а ў тым ліку і найбольш „балюча“ рэзала расейскае *паступовае грамадзянства*, якое сваімі высокімі ідэаламі заманівала лёгкаверныя „інародныя“ масы самахоць лезьці ў той кацёл, у якім сплаўляліся і перапаліваліся ўсе індывідуальныя нацыянальныя адзнакі нерасейскіх меньшасьцяў, каб служыць за гной для „вялікае, магутнае“ расейскае культуры.... І ня дзіва, што прадстаўнікі расейскага поступу не маглі зразумець, як *балючы* для „інародцаў“ ўвесь дэмакратычны расейскі „культуркампф“,—бязумоўна, больш небясьпечны дзеля самазахаваньня нацыянальнасьцяў Расейскае Імпэрыі, чым адкрыты паход проці іх расейскага чарнасоценства....

Здавалася-бы, што польскі соцыялізм, які ў царскай Расеі быў першым байцом за вызваленьне паняволеных нацыянальнасьцяў, які змагаўся ня толькі з „чорнымі“ абрусіцелямі, але і з „чырвонымі“, ня можа глядзець вачыма старых расейскіх с.-д. на нацыянальныя імкненьні „меншасьцяў“, якія ўключаны воляй „дужых гэтага сьвету“ ў межы Польскае Рэспублікі. Аднак, жыцьцё паказуе нешта зусім неспадзяванае і незразумелае: польскія соцыялісты і „крошачкі пабралі“ па старых расейскіх „чырвоных“ абрусіцелях, якіх так кляймяць цяпер... расейскія камуністы!

„Robotnik“ вустамі вядомага „соцыялэндэка“ Мечыслава Недзялковскага падыходзіць да пытаньня аб „нацыянальных меншасьцях“ ў Польшчы дужа „дыпляматычна“. Газэта ганьбуе нацыяналізм польскага грамадзянства—польскае буржуазіі і такой-жа мерскай хоча мерыць тое, што называе „нацыяналізмам“ беларусаў, украінцаў, немцаў і жыдоў. А раз і ў палякоў, і ў „меншасьцяў“ выяўляецца нацыяналізм, дык трэба і тут і там „біць яго, бы абухом па лобе!“ Паводле „Rob.“, нацыяналізмам „заражаны“ і беларускія дэмакраты і соцыялісты, — значыць—„бі і іх па лобе!“ Ды гэтак польскі соцыялізм далучаецца да паходу польскае буржуазіі, польскага нацыяналізму проці ўсіх меншасьцяў. А адначасна з гэтым партыя польскіх соцыялістаў, як некалі партыя расейскіх с.-д., разьвівае з усей энэргіяй, годнай лепшае справы, „чырвоны“ „культуркампф“ на і без таго ўціснаных няпольскіх „Kresach“.

Мы ўжо раз задалі пытаньне пэпээсаўскаму органу, ў *чым яны бачаць „нацыяналізм“*, прыкладам, *беларусаў*,—ня кажучы нават аб беларускіх соцыялістах, а аб беларусах наагул? На гэта газэта нічога не адказала, бо і *не магла адказаць*.

Запраўды, які тут можа быць адказ? Нацыяналізм наагул можа рэальна выявіцца толькі ў грамадзянстве, якое *пануе, мае ўладу* над грамадзянствам ці грамадзянствамі другіх нацыянальнасьцяў. Нацыяналізм—гэта *фактычнае, на дзеле падаўленьне аднэй нацыянальнасьцяй другіх*. І аб такім дзеяльным нацыяналізьме можна гаварыць толькі адносна да тых, *хто ўціскае другіх*. Можна, значыцца, гаварыць аб нацыяналізьме польскім, французкім і др., так сама, як некалі гаварылі аб нацыяналізьме расейскім, нямецкім. Але *ня можа быць гутаркі аб нацыяналізьме тады, калі ўцісканы народ бароніцца ад ўціску, ад зьніштажэньня яго*. І ў гэтай *абароне* прыймаюць учасьце ўсе сябры такога народу, незалежна ад таго, да якое клясы і палітычнае партыі прыналежаць, якой дарогай ідуць, якое тактыкі ўжываюць. У такім палажэньні былі некалі палякі, а ў тым ліку і польскія соцыялісты, ў межах царскае Расеі; ў такім палажэньні знаходзімся цяпер мы, беларусы, ў межах Польскае Рэспублікі,—і *беларускі соцыялізм* ў роўнай меры *змагаецца за беларускую нацыянальнасьць*, як гэта робяць беларускія ксяндзы і папы.

За сваё нацыянальнае „я“ мы ўсе, бяз розьніцы партыяў, будзем бароцца і далей, ня гледзячы на напасьці польскіх соцыялістаў, на абвінавачаньні нас ў нацыяналізьме. Паўтараем: перажывалі мы ўжо гэта ў старой Расеі, ды не паддаліся, не зьмяніліся нават пад ціскам соцыялістычнага „культуркампфу“; наадварот, зьмяніліся расейскія „чырвоныя“ „культуртрэгэры“. Не паддамося-ж і хітрыкам польскіх левых „культуртрэгераў“, ня гледзячы на ўсе іх няпрыстойныя выкрыкі і закіды. А будучына, хоць мо' йшчэ і далёкая, прымусіць і польскі соцыялізм прысвоіць сабе тыя пагляды на нацыянальнае пытаньне, якія дарогай чысьленых цяжкіх і балючых перажываньняў вытварылі сабе будаўнічыя Саюзу Соцыялістычных Радавых Рэспублік.

К. Фалькевіч.

„Ня кіем, дык палкаю“.

Ня маючы адвагі адразу зацісьнуць пятлю на справе беларускіх школаў, польскія ўлады разнымі дробнымі фармальнасьцямі тамуюць нармальнае разьвіцьцё нашых школаў. Есьць, як кажуць, навюсенькія цыркуляры, якія нармуюць справу закладаньня пачатковых беларускіх школаў і даюць ўсё-ж такі магчымасьць, пры пэўнай энэргіі насяленьня і спаўненьні ім некаторых фармальнасьцяў (сялянскія прыгавары, подпісы ня менш як сараку бацькоў і інш.),—засноўваць народныя прыватныя ці праўдзівей паўпрыватныя нашыя школы.

Нажаль, ня маючы пад рукамі гэтых навейшых цыркуляраў прасьветнае ўлады, ня можам, пакуль што, падлічыць усе плюсы і мінусы гэтых папераў датычна тых ці іншых навін у палажэньні нашае школы.

А што датычыць беларускіх гімназіяў, дык якраз у пачатку бягучага школьнага году іх ужо спаткалі новыя, нябыўшыя раней труднасьці. Напрыклад, справа памяшканьня Віленскае Беларускае Гімназіі, што ў Базыльянскіх мурах (цяпер „Dom rządowy“ ня саўсім ясная. Апрача таго некалькі вучыцялёў гэтае гімназіі ў гэтым годзе адпадаюць, як асобы, што ня маюць довадаў польскага „obywatelstwa“.

Радашкоўскай гімназія выдана школьным Куратарам концэсыя на бягучы школ. год, але не зацьверджана прадстаўленая кандыдатка на вучыцельку польскае мовы і агаворана ў концэсыі, што пусьціць у рух школу можна будзе не раней, ак па зацьвярджэньні новага кандыдата-вучыцеля паляністыкі, ці прасьцей кажучы польсказнаўства. Большасьць кандыдатаў у вучыцялі не зацьверджаны ізноў-жа праз няяснасьць справы іх дзяржаўнай прыналежнасьці, ці ўсё таго-ж самага „obywatelstwa“.

З боку фармальнага ўсё гэта надта прыгожа і акуратна. Ясная для кожнага рэч, што сказаць няма чаго проці саўсім зразумелага вымаганьня польскага ўраду, каб у школах навет нацыянальных меншасьцяў ня былі асобы з категорыі так званых „obcokrajowców“ ці па нашаму чужаземнікаў.

Але-ж раней практыка польскіх прасьветных уладаў ня знала гэткіх строгасьцяў у сэнсе „obywatelstwa“ вучыцялёў беларускіх гімназіяў і праз гэта шмат хто з іх проста чыста фармальна, дакумэнтальна не сьпяшаўся давесьці, сваю прыналежнасьць да грамадзян Польскае Рэспублікі, часта-часта будучы грамадзянінам Польшчы фактычна па ўсіх патрэбных прызнаках, вымаганых пэўнымі законамі.

Чаму-ж улада не папярэдзіла перад новым школьным годам загадзя аб сваіх вымаганьнях фармальнага „udowodnienia“ дзяржаўнай прыналежнасьці нашых вучыцялёў?

Бо што да самае процэдуры адтрымліваньня пашпартоў—гэтых аканчальных дакумэнтаў аб дзяржаўнай прыналежнасьці, дык мы не хацелі-б забіраць новага голасу па гэтым пытаньні пасьля таго, што сказаў нядаўна ў сваёй перадавіцы орган навет польскіх монархістаў—вілен. газэта „Słowo“ ў № 191 за 30 мінулага жніўня.

А вось што кажа „Słowo“ ў названай перадавіцы пад загалоўкам „Incognito“:

„Гісторыя выказвае, што спраўнасьць дзяржаўнай адміністрацыі мае першарадную вагу ў укладаньні дзяржаўнага патрыятызму грамадзян. Часамі чужыя, заборчыя дзяржавы ўмеюць прыцягнуць да сябе сэрцы граманзян толькі тым, што іх дзяржаўная адміністрацыя зьяўляецца непадкупнаю, чэснаю, даступнаю, а перш за ўсё спраўнаю.

Якою зьяўляецца польская адміністрацыя наагул, а асабліва на нашай зямлі?—задае сабе пытаньне аўтар артыкулу „Incognito“ п. G. K. і сьпяшаецца на гэта адказаць:

„Малы абразок адтрымліваньня пашпарта ў віленскім старастве можа шмат, вельмі шмат сказаць на гэта!

Запісі ў *чаргу*, каб скарыстаць з права (nadzwyczaj cenne uprawnienie) падаць прашэньне аб польскім „абыватэльстве“ адбываюцца ў Камісарыяце Ўраду на гор. Вільно ад 8 г. 30 м. да першае папалудні. Чарга гэта даволі вялікая, бо людзі, якія, напр., у пятніцу 24 жніўня 1922 году запісваліся, будуць мець права стаць перад дастойным абліччам вурадніка, які прымае прашэньні аб выдачы пашпарту, толькі ў дзень 23 лі-

стапада (так) 1923 г. (Ня верыцца, каб у гэтым месцы наборшчык разам з карэктарам шаноўнай газэты не памыліліся ў гадох!—К. М.). У гэты жаданы дзень інтэрэсанты ані не адтрымаюць пашпарту, а толькі пададуць прашэньне са ўсімі, трэбаванымі дакумэнтамі. Асабісты дакумэнт адтрымаюць толькі ўжо пасьля таго, як пройдзе 5 тыдняў, а значыцца, вяртаючыся да нашага прыкладу. чалавек, які запісаўся ў чаргу 24 жніўня, адтрымае пашпарт толькі ўжо пасьля 1-га студня 1924 г.

Адтрымае дакумэнт пэўна-ж настолькі, паколькі ўсё будзе спрыяць, паколькі не нарадзіўся ў Меншчыне, Ковенскай Зямлі ды іншых мясцовасьцях, якія ўжо сягоньня не зьяўляюцца Польшчаю, бо тады навет ахвотніцкая служба ў польскім войску, навет польскае ўрадовае палажэньне ў мінулым нічога яму не памогуць у пашпартных стараньнях.

Падчас стараньня аб пашпарце можа аказацца, што нейкага дакумэнту не стае. Тады Камісарыят паклікае сваю ахвяру, каб станавілася перад уладаю. З пагляду на канечную ашчоднасьць працы вураднікаў камісарыяту, ў павестцы не паказана якога іменна дакумэнту не стае. Бывае праўда, што вураднік, які прымае прашэньні аб пашпарце папярэдзіць, што не стае аднаго з вымаганых дакумэнтаў, але таксама бывае, што пасьля прыходу ахвяры ў канцэлярыю, вураднік вітае яе мілаю весткаю, што зьяўленьне яе лішняе, бо вымаганая папера спачатку згубілася, а цяпер ужо знайшлася. Для інтэрэсанта, які ў рэзультаце ўрадовай павесткі мусіў некалькі гадзін выстаяць у чарзе, вестка гэткая замест таго, каб рабіць мілае ўражаньне, мае ўсе прызнакі астаўпяваючай неспадзяванкі...“

Думаем, што гэта першая большая палова перадавіцы з віленскай газэты польскіх монархістаў найлепей зьілюстравала процэдуру адтрымліваньня пашпартоў у сталіцы нашага краю, дзе на чале справы фігуруе дэмократычна-інтэлігэнтная асоба Ўрадовага Камісара, які хіба што далёк вельмі ад спакойнага пазіраньня на канцэлярскую валакіту ў пашпартных справах.

Ці ў іншым якім месцы, па-за Вільняю, адтрымліваюцца пашпарты лягчэй, як тут, ня ведаем і таму параўнаньня рабіць ня зьбіраемся.

Ўся гэта, апісаная ў „Słowie“ пашпартная процэдура выглядала-б вясёлым фэльетонам, каб ня чулася за ёю страшэнная жыцьцёвая балячка.

Заўважым яшчэ ад сябе, што „Słowo“ апісвае, калі так можна сказаць, пашпартную процэдуру ў тых выпадках, калі ахвярамі яе зьяўляюцца прадстаўнікі *пануючай польскай нацыянальнасьці*, а што-ж сказаць аб адтрымліваньні пашпартоў людзьмі іншых нацыянальнасьцяў, якім наагул цяжэй дыхаецца.

Беднае, галоднае брларускае вучыцельства, якое ахвярна сее прасьвету на роднай мове нашай сярод нашага маладога пакаленьня, ня мае сілы, пры істнуючым палажэньні пашпартнае справы, здабыцца на экстрэнна-патрэбныя дакумэнты аб „абыватэльстве“, каб задаволіць вымаганьні школьных уладаў.

Каб не тамавалася наша школьная праца, патрэбна незабаўная інтэрвэнцыя Беларускага Пасольскага Клюбу перад Міністрам Прасьветы, каб ён выдаў распараджэньне цяпер у гэтым школьным годзе ня спыняць работы тых з беларускіх вучыцялёў, у якіх па рознага характару прычынах дасюль яшчэ не ў парадку асабістыя паперы.

Іншая рэч калі нас з гары хочуць сьцёбаць „някіем дык палкаю“, калі справу нашых школаў адкрыта залічуць да рэчаў у Польшчы саўсім непатрэбных, тады ўжо, хоць і ўсё стане ясным, але раду якую наўрад ці будзе відаць.

К. М.

Драматычны мамэнт...

Італьянскі фашызм, як кажуць самі фашысты, знутры пароджаны „засільлем камуністаў“ і наагул—соцыялістаў,—паняверкай нацыянальнага пачуцьця народу; з вонкавага, ў міжнародных адносінах—выкліканы той паняверкай „дзяржаўнай годнасьці“ Італіі і тымі крыўдамі для яе інтарэсаў, якіх дапусьціліся ў адносінах да яе яе сябры па перамозе над Нямеччынай—вялікія дзяржавы,—крыўды, на якія пазволілі яе „соцыялістычныя“, не маючыя „нацыянальнае гордасьці“ дасюлешнія ўрады...

Гэтак кажа ідэолёгія фашызму;—пад гэткімі лёзунгамі і йшла спрытная, упорная, пляновая, прайшоўшая „добрую школу“, фашыстоўская агітацыя...

Не датыкаючыся на гэты раз унутраных прычын паўстаньня фашызму, трэба прызнаць, што, калі пад „дзяржаўнай годнасьцяй“ і „нацыянальным інтарэсам“ разумець „раўнапраўе“ пры падзеле ўсяго таго, што было шчасьлівымі пераможцамі нарабавана ў пабітых Нямеччыны, Аўстрыі, Турцыі і інш., дык запраўды—адзіная з усіх вялікіх дзяржаваў Італія адтрымала, гэтак кажучы, „на піру багоў“—пераможцаў адны абъедкі.

Ня трэба забываць, што Антанта заплаціла Італіі „за кроў“ у значнай меры *турэцкімі* землямі, якія толькі што прыйшлося вярнуць у Лёзане прагнаўшай усіх налацеўшых жываедаў гаспадыні Турцыі...

Пад уражаньнем гэтае крыўды і йшла тая эволюцыя адбудаваньня „нацыянальнага духа“ Італіі, якая прывяла спачатку да дыктатуры фашыстоўскага „Напалеона“—Мусоліні,—а цяпер зусім лёгічна давела да нячуванага гвалту над мірнай, тройчы пабітай ў войнах, бязьсільнай Грэцыяй,—сябрам Італіі па вялікай, збавіцельнай Лізе Народаў...

Мы заўседы пішам, што, калі ня будзе затушаны той Рурскі сярэднявечны касьцёр, на „павольным агні“ якога Францыя, як праўдзівы дзьябал у пекле, падсмаліве присуджанага на Вэрсальскім Страшным судзе, на „вечную муку“ грэшніка-Нямеччыну, дык далёка лятучыя ад гэтага кастра іскры ня могуць не запаліць гдзесьці ў іншым мейсцы—ці такога самага кастра, ці нават новага пажару...

Добры прыклад не так заразьлівы, як Вэрсальскі...

Урэшце—і чым горшы Мусоліні ад Пуанкарэ? Што пазваляе Вэрсальскі трактат парыскаму Юпітэру, на гэта, як відаць, хапіла адвагі пазволіць самаму сабе і рымскаму...

Паслухайце, як добра паўтарае, амаль што ня ў тых самых выразах усе даводы свайго „права на гвалт“ наступнік рымскіх цэзараў, некаранаваны фашыстоўскі „кароль“ Мусоліні.

„Італьянскі ўрад забясьпечыў сабе залог (гэта значыць аружна зрабаваў у Грэцыі яе пекны востраў Корфу“ і, маючы гэтыя гарантыі, будзе трымаць іх у сваіх руках да часу поўнага і дасконага выпаўненьня Грэцыяй варункаў, пераліченых у нашай ноце. Калі Грэцыя выпаўніць гэтыя варункі, дык мы спынім окупацыю. Але раджу Грэцыі пасьпяшыць, бо ў будучым тыдню яна павінна будзе заплаціць яшчэ шмат болей—дзеля агромных коштаў, якія цягне за сабой опэрацыя флёта...

Калі-б Грэцкі ўрад ня споўніў нашых жаданьняў, дык, выбачайце,—тады нашыя войскі застануцца на Корфу без абмяжаванага тэрміну...—як гэта ўжо здаралася ў нашай гісторыі—(з Вэнэцыяй)—на... чатыры сталецьці“...

Як ведама, Мусоліні зрабіў усё магчымае, каб ня даць ані маральнай ані на'т фізычнай магчымасьці Грэцыі, як суверэннай дзяржаве, споўніць яго варункі: ён зусім сьвядома даў Грэцкаму ўраду толькі 5 гадзін на развагу і адказ, ўжо гэтым самым нячуваным у гісторыі тэрмінам ультіматуму зрабіўшы яго несцярпімай абразай, ня кажучы ўжо аб яго змесьце...

Цяпер заняўшы Корфу, ён робіць для зусім згалеўшай ад вайны Грэцыі *грашова* нямагчымым выхад з палажэньня—інакш, як... заставіўшы „залог“ у руках аружнага растаўшчыка на 4 сталецьці...

Пры гэтым усім Мусоліні пастаянна падчырківае (далей пабачым дзеля чаго), што ўсё, што ім зроблена аружным гвалтам і нахрапам, *з бамбардаваньнем мірнага насяленьня пушкамі свайго флёту*,—ён *зусім ня лічыць... ваеннымі крокамі*...

Але, калі-б Грэцкі ўрад, з сваяго боку пачыніў якіясь рэпрэсыі ў адносінах да італьянскіх грамадзян ці іх маёмасьці, ў Грэцыі, тады, кажа, Мусоліні,—справа іншая: „тады мы пойдзем вайной“...

Гэтак размаўляе воўк з ягнём, ці шчупак з карасём...

Гэтак прамаўляе ў XX сталецьці вялікая Эўрапэйская дзяржава да свайго сябра па Вільсонаўскай Лізе Народаў.

Як ведама, Грэцыя, адтрымаўшы ультыматум Італіі, зьвярнулася да засядаючай у Жэнэве Рады Лігі Народаў, слушна лічучы, што падпісаўшы, разам з Італіяй, як сябры, яе статут, мае ня толькі права, але і абавязак перадаць усю справу на рашэньне гэтага суда „народу“.

І вось для сымпатычнай Лігі настае гадзіна вялікае спробы...

Цяпер цэлы сьвет пабача, як на далоні, што такое ёсьць у запраўднасьці такая пекная Ліга Народаў.

— Ці яна істнуе, як прыдатак да Вэрсальскай Акцыйнай Суполкі вялікіх дзяржаў, каб гарантаваць іх гэгэмонію і бараніць іх інтарэсы проціў малых; ці запраўды мае „маральную“ ці іншую моц—падпарадкаваць свайму аўтарытэту і папаўшага на лаўку падсудзімых вялікага дзяржаўнага бандыта...

Веры ў гэта апошняе—надта мала...

Ужо Францыя паказала прыклад таго, як лёгка вялікая рыба прарывае той сплецены ў Вэрсалі брэдзень Лігі, ў які павінны добра лавіцца дробныя...

Але ў Пуанкарэ была прынамсі хаця відзімасьць „юрыдычнае“ аргумэнтацыі, калі ён катэгарычна адмовіўся перадаць усю справу адшкадаваньняў і окупацыі Руры на суд Лігі: Нямеччына ня ёсьць яшчэ сябрам Лігі...

Нядаўна гэтак сама „развважала“ эндэцкая „Gaz. Warsz.“ немцы ў Польшчы ня маюць права жаліцца ў Лігу Народаў, а палякі ў Нямеччыне маюць...— Дзеля таго, што—польскіх немцаў можна душыць, а палякаў у Нямеччыне ня можна...

Гэтак сама рэклямавала аўтарытэт Лігі і Францыя.

І гэтыя лекцыі пайшлі накарысьць...

Мосоліні ня толькі адмовіў, як адсек, перадаць справу ў Лігу, але прыгразіў адзваць прадстаўнікоў Італіі з Рады, а нават зусім выйсьці з Лігі, калі Рада пастановіць разглядаць заяву Грэцыі і ўсю справу—ад Яніны да Корфу...

У сваей заяве ўрадам вялікіх дзержаваў Мусоліні з нязвычайным, нават для Вэрсальскай Эўропы, голым і спрытным цынізмам, „адкідае компэтэнцыю Лігі Народаў у конфлікце Грэка-Італьянскім“. Вось ягоныя „матывы“.

1. Рэвалюцыйны, праступна-казніўшы сваіх быўшых міністраў урад Грэцыі—ня прызнаны яшчэ дзяржавамі... І калі-б Ліга прыняла і разглядала яго заяву, дык гэта значыла-б, што ён дабіўся гэтага важнага для яго прызнаньня дарогаю... забойства італьянскай місыі. Гэтага Італія дапусьціць ня можа...

2. У конфлікце з Грэцыяй зачэплены „дзяржаўны гонар“ Італіі, а вядома, што „справы ганаровыя“ кожны шануючы сябе павінен бараніць сам... з аружжам у руках...

3. § 12 статуту Лігі, на моцы якога Грэцыя зьвярнулася да Лігі, ня можа быць застасаваны ў гэтым прыпадку, бо гаворыць аб перадачы спрэчак, якія пагражаюць вайной. Але спрэчка Італіі з Грэцыяй не пагражае вайной, бо... Італія зусім шчыра ня мае ніякіх ваенных замераў. І нават не зарвала з Грэцыяй дыплёматычных стасункаў.

Далей цынізм ісьці ня можа...

К. Меч.

Праціванаступ.

Можна здаецца сьцьвердзіць, што апошняя забастовачная хваля ў ліпні і жніўні гэтага году будзе мець для разьвіцьця работніцкага руху ў Польшчы шмат большае значэньне, як папярэднія змаганьні за заработную плату, праўда, не дзеля таго, што асягнутыя вынікі былі большыя, чым папарэднія. У сучасных варунках, з прычыны ўсё ўзрастаючай дарагоўлі, кожная, бадай. забастоўка закончваецца, як быццам, „перамогай“ работнікаў, а заработкі іх „павялічываюцца“ нармальна нават і без забаставак на падставе толькі аблічэньняў статыстычнай камісіі. Але горкі досьлед вучыць, што ўсе гэтыя „перамогі“ — надта нятрывалыя, а „падвышкі“ толькі паказныя, бо фактычна ступень дабрабыту работнікаў усьцяж пагаршаецца.

Паскольку можна судзіць, забастоўкі, якія адбыліся ў ліпні і жніўні, таксама ў выніках далі толькі гэтыя *статыстычныя* падвыжкі, а значыцца не маглі зьмяніць па сутнасьці палажэньня работнікаў, і ў гэтым і ёсьць значэньне забастовак апошніх часаў. Розьніліся яны ад папярэдніх сваімі вялізарнымі разьмерамі, сваею агульнасьцю, а яшчэ і тым, што яны былі толькі складоваю часткаю і аднэй з праяваў агульна-эўропэйскага руху работніцкіх масаў. Мы маем тут справу з новым *пераломам* у псыхолёгіі, а знача і з новым важным пэрыядам соцыяльных змаганьняў. Мінуўшы пэрыяд агульна можна-б схарэктарызаваць, як пэрыяд тактычнага адступленьня расейскай рэволюцыі і шуканьня праз яе компромісу з сусьветным капіталізмам, а раўналегла з тым—пэрыяд усестароннай атакі буржуазіі ўва ўсіх краёх на работніцкія пазыцыі. Рана яшчэ было-б падлічаць вынікі гэтага наступу капіталу. Не падлягае сумлеваньню, што даў ён буржуазіі ў шмат якіх краёх вялікія карысьці. З боку палітычнага гэта выявілася ў ухіленьні нават рэшткаў відзімасьці работніцкіх урадаў (напр. у Нямеччыне і ў Аўстрыі) і пераходзе ўлады ўва ўсіх адыгрываючых першыя ролі дзяржавах да больш ці менш яўнай капіталістычнай рэакцыі (консэрватысты ў Англіі рэспубліканцы ў Злучаных Штатах, нацыянальны блёк у Францыі, фашысты ў Італіі, хьена ў Польшы і г. д.). У вобласьці гаспадарчай галоўнай карысьцяй буржуазіі зьяўляецца бязсумліўнае пагаршэньне матэрыяльнага дабрабыту працоўных масаў. Гэтае пагаршэньне ў адных краёх было накінута шляхам грубай сілы (фашызм і белы тэрор у цэлым раду вялікіх і малых дзяржаў), у другіх было вынікам некарыснага для работнікаў гаспадарчага палажэньня (напр. недахват працы і локауты ў Амэрыцы, Англіі і г. д.), альбо ўсё ўзрастаючай дарагоўлі, якая аўтоматычна і незаметна аднімала работнікам усё новы кусок хлеба, а ў іншыхжа—было дасягнута пры помачы ўсіх гэтых спосабаў разам узятых.

З вышэйсказанага ясна, што калі гэтыя вынікі не далі яшчэ буржуазіі аканчальнай перамогі, дык у кожным выпадку аблягчылі яе. Аканчальнай перамогай можна назваць тады, калі яна мае адзнакі трываласьці, г. ё. калі створанае праз яе палажэньне рэчаў мае ў сабе варункі свайго пастаяннага аднаўленьня. Вось-жа ці цяпер сусьветная буржуазія пазбавілася ад пагрозы сусьветнай рэволюцыі? Здаецца, ніхто не адважыцца гэтага цьвердзіць, а гэта ўжо адно не пазваляе гаварыць аб аканчальнай перамозе. Але як бы там ні было, здабыўшы неагранічаную *ўладу* і *пагоршыўшы быт* працоўнага люду капіталізм знайшоў *пер[illegible]ы варунак* і прадпасылку сваеў адбудовы. Лёгка дзеля гэтага зразумець, што ўдача гэтай першай уступнай кампаніі капіталізму павінна было на пачатку, ад'емна адбіцца на энэргіі і баявой здольнасьці работнікаў. Істнаваўшыя сярод іх надзеі на хуткі правал пануючай гаспадарчай сыстэмы ня зьдзейсьніліся, а ўжо самы факт трываньня гэтай сытуацыі пачалі лічыць за праяўленьне сілы і адпорнасьці гэтай сыстэмы. Вось дзеля чаго мінуўшы пэрыяд быў наогул пэрыядам удушэньня работніцкага руху. Пролетарыят ня толькі задаваляўся тактыкай абароны, але вельмі часта згаджаўся нават без барацьбы на меншыя альбо большыя уступкі.

Не падлягае сумляваньню, што ўсе палітычныя і гаспадарчыя карысьці, здабытыя праз атакуючы капітал былі так лёгка дасягнуты, дзякуючы гэтай пасыўнасьці і ўдушэньню працоўных масаў. Не падлягае сумлеваньню, што нават уплывы капіталістычнай ідэолёгіі сярод работнікаў пашырыліся. Работніцкія масы, пасьля таго, як надзеі на хуткі пераварот ня споўніліся, а дарагоўля, нэндза і безрабоцьце, што дзень мацней сталі адчувацца, пачалі сьвядома ці падсьвядома паддавацца капіталістычнай дэмагогіі, якая даказвае, што паляпшэньне работніцкага быту залежыць ад адбудовы капіталізму, а гэтая адбудова капіталізму вымагае поўнасьцю адмовіцца ад усялякіх рэштак „дзяржаўнага соцыялізму“ і разгулу нічым не зьвязанай свабоды конкурэнцыі, свабоды гандлю і іншых капіталістычных свабодаў, якія па сутнасьці заўсёды зьяўляюцца нічым не абмяжованай свабодай вызыску. Прычынілася да гэтага таксама банкруцтва ўсіх павaенных спробаў павольнага прышчапленьня соцыялізму пры адначасным захаваньні карэньняў капіталізму. Раз усе рэквізыцыі, максімальныя цэны, соцыялізацыі, павышанныя падаткі і іншыя на пагляд пекныя рэформы рабілі перашкоды капіталістычнай формай задаваляць патрэбы грамадзянства, але на яе месца ня ўводзілі ніякіх элемэнтаў новай арганізацыі іх зада-

Італьянскі пірат папросту выбраў час і выпадак, выбраў сабе падабаўшыся яму пекны чужы востраў і рашыў... забраць яго—без вайны, добра ведаючы, што моцна пабітая ў войнах Грэцыя ваяваць наагул, а тым болей з магутнай Італіяй ня можа...

Але ці-ж гэтае ўсё у нашых часох у дзіва?!

Ці-ж мы, беларусы, ці віленцы, ці іншыя браты-ураінцы будзем гэтак моцна здзіўлены гэткім рабункам у вялікім міжнародным маштабе?

Ці-ж мы ня чулі нават на гэтых днёх, як „адзін з найшляхэтнейшых палякоў“, прадстаўнік першага „гераічнага“, „вялікадушнага“ пэрыяда ўваскросшай людовай Польшчы пашыраў у Вільні цэлую тэорыю аб „фактах дакананых“, якая не зрабіла-б стыду самому „Начальніку Фашыстоўскага Паньства“ — Мусоліні...

Пабіўшы вялікага „чорта“, „вайна і мір“ нарадзілі столькі яго малых „дзяцюкоў“, што дапраўды нявядома, хто з іх горшыя: ці адзін вялікі, ці „легіон“ малых...

Але фашыстоўскі Пулсудскі мыляецца, калі ўважае, што кожны, нават з вялікіх дзяржаваў, можа браць тое чужое, што „плохо лежит“, як кажуць расейцы.

Тутака яму, можа, запраўды прыдзецца даведацца, што „quod licet Jovi, non licet bovi“, як казалі яго продкі ў старажытным Рыме.

„Царыца мораў“ Англія наагул надта ня любіць, калі хто, апрача яе самой, ці паміма яе, бярэ тое, што дрэнна ляжыць на моры ці паміж мора...

І зусім не на тое яна ў 1864 г.дабілася міжнароднай гарантыі прыналежнасьці пекнага і падабаўшагася ёй самой вострава Корфу да слабай і заўсёды бышай пакорнай ёй Грэцыі, каб спакойна і маўчком глядзець на тое, што гэты востраў бярэ сабе сама без параўнаньня мацнейшая і самастойнейшая Італія...

Уся ангельская грамадзянская опінія, з вытлумачаным намі вышэй шляхэтным абурэньнем выступіла проціў Італіі „на абарону пагвалчанай Грэцыі...

Мы ведаем, якую сілу мае ў Англіі гэтая опінія.

І вось зараз-жа гэтая маральная сіла опініі... закруціла гвінты і калёсы ў крэйсэраў і дрэдноўтаў ангельскага флёту і скіравала значную частку паўночнай эскадры яе ў Міжзямельнае мора...

У порт вострава Корфу ўжо ўвайшоў адзін з самых пекных і моцных ваенных караблёў Англіі... Рэшта групуюцца побліж...

Мы ведаем, што Англія ў даўгу перад Грэцыяй за апошнюю вайну з Турэччынай, бо яна ўласьне парадзіла Грэцыі ваяваць...

І тое, што Англія „выбачала“ Францыі, яна можа не падараваць Італіі...

Пажар можа ўзьняцца што мінуту...

Ці затуша яго вадою сваіх прамоў і „парад“ Ліга?..

— Ня ведама... Ўва ўсякім выпадку мамэнт — надта драматычны...

Ці пакажа Ліга сваю „моц“, ці выявіць сваю „немач“?

Ці дазволіць Англія Італіі, замест сябе, абрабаваць Грэцыю, ці—вымяце італьянскі флёт з порту вострава Корфу?

Цяжка адказаць...

Але-ж ня можна ня бачыць таго, што ізноў Францыі шанцуе, як запраўднаму ўтопленіку!..

Гэта-ж яна, Францыя, вырашыць гэтае пытаньне, выбраўшы каго „падтрымаць“ з сваіх двух „прыяцеляў“—ці Англію ці Італію... А Грэцыі... ўжо ўсе робяць толькі выгавары...

І, як нам здаецца, „сваяк“ Пуанкарэ—Мусоліні можа быць спакойны: недарма ён радзіўся ў „Вэрсальскай кашулі“...

Хай кожны з нас, агледзіўшыся навакола сябе, пабача: *ўсюды мае толькі той, хто рабуе*...

Гэткія ўжо цяпер па вайне „мірныя“ „вэрсальскія“ часы...

С.

Палітычныя падзеі.

Грэка-італьянскі конфлікт, ці конфлікт Італіі з Лігай Народаў?

Не зважаючы на пратэсты Мусоліні, пагражаўшага адазваць з Рады дэлегатаў Італіі, а на‘т зусім выйсьці з Лігі, Рада Лігі разгзядала справу аб конфлікце.

Хаця Рада фармальна адлажыла на пару дзён вырашэньне пытаньня аб сваей компэтэнцыі пастанавіць рашэньне па сутнасьці справы, але фактычна ўжо такую сваю компэтэнцыю прызнала, не зважаючы на пуста-вялічавую прамову Саландры.

Усе найбольш уплывовыя сябры Рады, як Робэрт Сэсіль (Англія), Гюманс (Бэльгія), Брантінг (Скандын. дзярж), нават прадстаўнік Францыі Ганото, ня лічучы інш. драбнейшых, высказаліся проціў Саландры.

Усе яны казалі, што § 12 і 15 статуту Лігі ня толькі даюць права, але на‘т абавязываюць Раду разглядаць заяву Грэцыі і ўмешацца ў справу; што калі-б Рада ўхілілася ад гэтага праўнага і маряльнага абавязку, дык гэта азначала-б яе поўнае банкруцтва.

Пастаноўлена пакуль што прыняўшы пункт гледжаньня Рады Паслоў (адказнасьць Грэцыі за забойства на яе тэрыторыі—гэта ёсьць і пагляд самае Грэцыі,) у супрацы з ёй (Радай Паслоў) сьлядзіць ход справы.

Магчымы такі выхад: Рада Лігі, прызнаўшы прынцыпова сваю компэтэнцыю,—каб не дражніць амбіцыі Італіі, перакажа ўсю справу Трыбуналу Справядлівасьці ў Газе.

З усяго відаць, што Пуанкарэ рашыў, выдаўшы галавой свайго італьянскага калегу, падтрымаць сваю магутную „прыяцельку“ канкурэнтку Англію, вядома-ж ня дарма, але за якія-небудзь „компэнсацыі“..,

Адсюль голас Англі адразу ўмацаваўся, і яна стала гаварыць з Мусоліні... амаль ня так, як Мусоліні з Грэцыяй...

Мін. загр. спраў Англіі лёрд Кэрзон ня толькі рэзка заявіў італ. паслу, што Англія не дазволіць пагвалчэньня аўтарытэту Лігі (гэта значыць „матэр‘яльна“—захапленьня востр. Корфу і іншых Італіяй), але, як пішуць з Лёндына бэрлінскім газэтам, на‘т выслаў да Мусоліні ультыматум—аб эвакуацыі грэцкіх вастравоў...

Па ўмове з Францыей Англія, відаць, бярэ на сябе ня толькі ініцыятыву, але і выпаўненьне рашэньня — змусіць, калі будзе патрэбна—нават сілаю Італію ачысьціць вастравы...

З Лёндына даносяць, што ўсе камандзіры карпусоў і начальнікі эскадраў адтрымалі загад быць нагатове—да магчымае мобілізацыі...

Хаця ангельскі ўрад афіцыялцна апраўяргае гэтую вестку, гаворачы, што такога загаду ня было, што Англія будзе... чакаць на рашэньне Рады Лігі Народаў. А газэты ангельскія дадаюць, што ўсё будзе залежаць ад таго, ці падпарадкуецца Італія гэтаму рашэньню.

Пакуль што пастаноўлена зрабіць у Міжземным моры дэмонстрацыю сіламі злучаных флётаў Скандынаўскіх дляржаў...

Другім крокам, як кажуць ангельскія газэты была-б марская блёкада Італіі. Даволі ўзглянуць на карту Італіі, каб зразумець, што значыць для гэтага паўвостраву блёкада...

Трэцім крокам,—пры трываючым упорстве Мусоліні—былі-б актыўныя дзействы, напр., ангельскага флёта—з упаважненьня Лігі Народоў, ці Гаагскага Трыбуналу... Не вайна, як кажа сам Мусоліні ў адсінах да Грэцыі... але „карацельная экспэдыцыя“...

Да гэтага, трэба думяць, не дойдзе...

Мусоліні ўжо напалову спасаваў: і дэлегатаў з Рады не адазваў і Італіі з Лігі ня „вывеў“...

Прыдзецца, відаць, выпусьціць ўсю захопленую дабычу з рук...

Прыдаўся, відаць, пекны надта падабаючыся Англіі востроў Корфу для „умацаваньня аўтарытэту Лігі народаў“...

ПОЛЬШЧА.

31 жніўня абег банкнотаў у Польшчы выносіў 6.871.776.522.382 маркі; у апошнія толькі 10 дзён жніўня выдрукавана новых банкнотаў на суму 1.481.582.810.764 маркі, г. зн. што дня друкавана каля 150 мільярдаў марак. Калі друкаваньне і далей пойдзе гэткім тэмпом дык праз 2—3 месяцы і ў Польшчы можа вытварыцца „нямецкая“ сытуацыя.

Варшаўскія газэты паведамляюць, што чорная біржа рэагавала на назначэньне міністрам фінансаў п. Кухарскага (эндэка) звышкай курса доляра да 282.000 мар. польск.

Згодна з пастановай саюзу чугуншчыкаў, абвяшчаючай забастоўку ў выпадку невыпаўненьня работніцкіх жаданяў, пасьля мнагалюднага мітінгу, ў Пазнані распачалася забастоўка чугуншчыкаў. Забастоўка ахоплівае чугуначные майстэрні і частку служачых на станцыі. Цягнікі ходзяць нармальна. Прычынай забастоўкі зьяўляецца не выплата дадатку на дарагоўлю за ліпень і жнівень.

Забастоўка дворнікаў у Варшаве, якая распачалася 13 жніўня яшчэ не закончылася.

У тытунёвай прамысловасьці пагражае безрабоцьце. Ад 4 верасьня ўва ўсіх тытунёвых фабрыках у Варшаве, Горадні, Вільні, Беластоку і Берасьці зьменшаецца лік рабочых дзён да 3—2 у тыдзень, частка работнікаў выдалена, некаторыя фабрыкі зусім спыняюць дзейнайьць.

Па загаду камісара г. Варшавы канфіскавана аднаднёўка „Ze Swiata Robotniczego“.

Украінская часопісь „Селянська Правда“ якая выходзіла ў Луцку, зачыняна па пастанове Луцкага Акружнога Суду. Вышла аднаднёўка „Селянська Доля“, большая частка артыкулаў якой сконфіскавана.

НЯМЕЧЧЫНА.

У Бэрліне ў прысутнасьці канцлера Штрэзэмана адбылася нарада дэлегатаў окупаваных абшараў. Нарада мела сакрэтны характар. Канцлер зрабіў даклад, у якім, выказаўшы оптымістычны пагляд на загранічную палітычную сытуацыю Нямеччыны, заявіў, што ў хуткім часе трэба спадзявацца, што Нямеччына выступіць з прапазыцыямі аб распачацьці перагавораў з Францыяй і Англіяй.

Як паведамляюць з Дюсэльдорфу пасыўны спраціў у окупаваных абшарах слабее. Ходзяць чуткі, што Францыя мае замер узяць пад свай загад усе заводы Крупа.

Марка нямецкая спала яшчэ болей. Курс доляра—47 мільёнау мар. нямецкіх. Дэмократычная партыя прыняла рэзолюцыю, якая дамагаецца аддачы пад суд быўшых міністраў фінансаў: Розэнбэрга, Бэккера і Гермэса за іх гаспадарчую палітыку.

С. С. Р. Р.

Урад Саюза Радавых Рэспублік праводзіць у жыцьцё некаторыя частковыя ваенныя рэформы. Між іншым ствараюцца асобныя нацыянальныя аддзелы,

---

валеньня, дык павінны былі скомпрамітаваць самы прынцып *рэформістычнага утопізму*. З гэтай компромітацыі скарыстала ў пэўнай меры таксама ідэолёгія „чыстага“ капіталізму. Змучаныя работнікі сьвядома ці падсьвядома пачалі сьхіляцца да спробы ці ня будзе магчымай да прыняцьця цаной нават павялічаны капіталістычны вызыск за ўзварот сякога-такога трывалага устанаўленьня адносінаў і хаця-б адноснай, перадваеннай пэўнасьці істнаваньня. Не падлягае сумляваньню, што іменна гэтыя настроі працоўных масаў былі аднэй з прычын, аблягчыўшых палітычныя і гаспадарчыя здабыткі буржуазіі, аж да фашызму ўключна.

Вось-жа бязьлітаснае разьвіцьцё адносінаў разьвеяла гэтую новую *ілюзію капіталістычнай рэакцыі*, падобна як раней разьбіла ілюзіі бязсільнага рэформізму. Моральны крэдыт, удзелены рэакцыйнай буржуазіі часткай люднасьці, вычэрпваецца. Аказалася, што ні захват неаграніччанай улады, ні найбольшыя аблягчэньні экслёататарскім імкненьням капіталу не вядуць яшчэ да адбудовы капіталізму нават у граніцах нацыянальных, а тым больш у сусьветным маштабе. Няма ніводнага краю, дзе-б капіталістычная рэакцыя выклікала іншыя пасьледствы, апрача павялічанай нэндзы, адчаю, пачуцьця няпэўнасьці і часовасьці, апошняга напружаньня і пагрозы зьбліжаючайся катастрофы. Усе варунку разлажэньня, як напр. дрэннае становішча валюты, альбо застой у вытварчасьці ня толькі не аслабелі, але ўсё мацней даюць сябе адчуваць. Адначасна разгараюцца ўзрываючыя капіталістычны сьвет міжнародныя супярэчаньні, прыймаючыя проста драматычныя формы, дасягаючыя нават да найбольш апатычных асобаў,—як напр. пагражаючы разрывам каоліцыі адвечны торг за нямецкія адшкадаваньні і т. п.

Вось-жа калі сусьветная буржуазія выйгрывае свае апошнія карты, калі выяўляецца, што *ўсялякія* мэтады адбудаваньня капіталізму зьяўляюцца аднолькава утопічнымі, калі разьдзіраючыя гэты капіталізм унутранныя супярэчнасьці зло сьмяюцца як з жалезнага кулака фашыстаў, так і з засушанае мудрасьці профэсарскага рэформізму, — дык адначасна ў процілежнасьць да ўсяго гэтага адзіны на сьвеце край з соцыялізаванымі срэдствамі вытварчасьці і абмену, адзіны край, дзе тэхнічныя і натуральныя багацьці сталіся ўласнасьцю працоўнага колектыву, дае нябывалы ў гісторыі абраз перамогі надлюдзкіх труднасьцяў і паўстаньня з страшэннай руіны. Калі на ўсім сьвецевялізарная большасьць людносьці кожны дзень пападае ўва ўсё большую нэндзу, а нават гэты павялічаны вызыск не прычыняецца да гаспадарчай адбудовы, але марнуецца на *мёртвыя кошты* капіталізму (напр. узбраеньні і г. д.), дык тут уся тэхнічная і культурная адсталасьць, уся эканамічная залежнасьць ад варожай заграніцы ня могуць перашкодзіць шыбка ідучаму ўперад паляпшэньню народнага гаспадарства і зьвязанага з ім узрастаючага дабрабыту працоўных масаў.

Зусім відавочна, што гэтыя спусташэньні, пашыраемыя праз сусьветны капіталізм, і гэтае добра неўсьвядомленае, але адчуванае праз усіх гаспадарчае ўмацаваньне Саюзу Соцыялістычных Радавых Рэспублік павінны былі абавязкова прывясьці да новага рэвалюцыйнага пад‘ему ў Эўропе. Цяперашняе ажыўленьне, якое мы бачым амаль ува ўсей Заходняй Эўропе, зьяўляецца пладом горкіх досьледаў капіталістычнай рэакцыі, а знача вынікам разьбіцьця *апошніх ілюзыяў*, якія маглі пагражаць работніцкаму руху. І гэтае ажыўленьне будуе свае надзеі і рахубы не на нейкай дапашозе, але на досьледах і першых удачах колектыўнай, пляновай соцыялістычнай гаспадаркі, а знача на грунце даволі трывалым і абшырным.

Гэта ёсьць добрая варажба для распачаўшагася работніцкага проціванаступу. Калі напрыклад у Польшчы беспасрэднай мэтай апошніх забастовак былі перадусім часовыя падвыжкі, дык усёж-такі і яны рабілі значны поступ у параўнаньні з даўнейшым рухам. Трэба памятаць, што бралі ў іх чыннае і выдатнае ўчасьце нават тыя работніцкія элемэнты, якія ня толькі йшлі пад сьцягам соцыяльнага угадоўства, але нават заўсёды былі прыладай для зрываньня забастовак,—як напр. энпэроўцы, хадэкі і г. д. Зразумела, што гэты рух ня мог адразу высунуць зусім адналітай праграмы жаданьняў. Аднак сама па сабе злучаннасьць і солідарнасьць барацьбы за павялічэньне заработнай платы была ўжо першай паважнай перамогай адналітага фронту. Далейшыя-этапы павінны прысьці з натуральнай абавязковасьцю. Жоўтыя і напалову-жоўтыя арганізацыі ня маглі ўстрымаць сваіх сябраў ад барацьбы і прымушаны былі ўзяць у ёй учасьце, бо ніводнаму работніку ня можна ўжо ўталкаваць, што фабрыканты самі найлепш памятаюць аб іх долі. Але таксама, як магутная неабходнасьць прымусіла найбольш адсталыя рады перайці ад зрываньня забастовак да салідарнай барацьбы, таксама далейшыя досьледы пераканаюць усё больш шырокія масы, што ніякія часовыя падвышкі ня вырвуць іх з кіпцюроў дарагоўлі, што дарагоўля гэтая ёсьць проста праява агоніі капіталізму і што ў барацьбе з гэтым злом патрэбны адналітая і сьвядомая мэты праграма жаданьняў, скіраваных к таму, каб увесь ход гаспадарчага жыцьця паддаць колектыўнаму кантролю працоўных масаў і каб зламаць арганізацыю матэрыяльнай сілы, утрымліваючай сучаснае становішча капіталістычнай анархіі са шкодаю амаль для ўсей людносьці.

(„Nowa Kultura“).

які будуць істнаваць адначасна з агульна-дзяржаўнай арміяй і служыць для абароны паасобных рэспублікаў.

ГІШПАНІЯ.

Гішпанія перажывае цяжкія дні. Камуністычны рух разьліваецца шырокою хваляю. Добры грунт для агітацыі стварае экспэдыцыя ў Мароко для задушэньня мароксжага паўстаньня. Жаўнеры колькі разоў адмаўляліся ісьці ў паход, пры гэтым даходзіла да забойства афіцэраў. Шмат разоў паўстанцы разьбілі гішпанскія войскі, але ўрэшце паўстаньне, здаецца, зьліквідавана.

ЯПОНІЯ.

Апошнія тэлеграфныя весткі паведамляюць, што страты ў людзях ад землетрасеньня крыху меншая, як аб гэтым пісалі ў газэтах. Каля 5 мільёнаў асобаў пазбаўлены памешканьняў. Урад сьпешным парадком будуе часовыя баракі. У часе землетрасеньня загінула 2 вялікія ваенныя караблі.

ГДАНСК.

Выбары да Гданскага Сэйму вызначаны на 18 лістапада.

З УСЯЕ БЕЛАРУСІ.

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.

ХРОНІКА.

У нядзелю 9 жніўня адбылося паседжаньне прэзыдыуму Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні. Пастаноўлена склікаць пленарнае паседжаньне Беларускага Нацыянальнага Камітэту. Парадак дня: выбары прэзыдыума, плян далейшай дзеяльнасьці Камітэту. Паседжаньне адбудзецца ў нядзелю 17 жніўня а 4 гадз. ў памешканьні Беларускай Школьнай Рады (Віленская 12, п. 6).

Усім арганізацыям, уваходзячым у склад Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, прапануецца выслаць па два дэлегаты з адпаведнымі мандатамі.

Пасля вядомай галадоўкі палітычных арыштаваных ў Беластоцкім вастрозе, найбольш актыўныя з іх як Аляксандар Станкевіч, Кастусь Матэйчук, Сьцяпан Жабінскі і інш. вывязены з Беластоцкага вастрогу ў Пазнань.

5 і 6-га верасьня сьледчая камісія ў Сакольцы дапрашвала сьведкаў у справе сьмерці арыштаванага Якуба Якушэвіча, аб чым мы пісалі ў № 4 „В.С“. Паміж іншымі быў дапрошаны пасол Валошын.

Грамадзяне м-ка Сіняўка, Нясьвіскага пав. паведамляюць, што 21 верасьня ў Сіняўцы адбудзецца вялікі фэст, на які запрашаюць беларускіх паслоў, каб зрабілі справаздачу з соймавых працаў.

Весткі з вёскі.

Тартак Жардэлі, Вішнеўскай гм.

Дрэннае становішча польскага скарбу і спадак польскай маркі, што йдзе на карысьць прамыслоўцам, гандлярам і розным спэкулянтам, вельмі цяжка адбіваецца на жыцьці работніка. У канцы кожнага месяца работніку прыходзіцца адтрымліваць палавінную частку тэй вартасьці, якая была ў пачатку месяца, а то ў 2 ці 3 разы менш. Гэткім парадкам работнік адтрымоўвае ледзьве палавіну а то і 1/4 пражытачнага мінімума для сябе, а каб пракарміць жонку ці дзяцей—дык няма чаго й гаварыць.

Вось гэтае цяжкае палажэньне і прымусіла работнікаў нашага тартаку зарганізавацца, бо чулі мы, што ў аб'еднаньні сіла, а гэтая сіла нам патрэбна, бо нас кожнага паасобку голадам замораць і высмакчуць з нас апошнія сокі. Як толькі мы зарганізаваліся ў профэсыянальны саюз, дык адразу загадчык і адміністрацыя тартаку занепакоіліся, чуючы ў нас магутную сілу, гатовую ўва ўсякі мамэнт стаць ёжам ў абароне сваіх правоў.

Надта кепскія адносіны адміністрацыі і Вішнеўскай паліцыі да зарганізаваных работнікаў прымусіла наш проф. саюз выклікаць да сябе з Вільні Сэкрэтара Дрэўлянага аддзелу профсаюзаў, каб нашай маладой арганізацыі лепш умацавацца. З прыездам сэкрэтара паліцыя ўся была на нагах. Усякага работніка паліцыянты дапытываюць ці запісаўся ў проф. саюз і калі работнік адкажа, што запісаўся, дык да яго чапляюцца з рознымі прыдзіркамі, каб нагнаць страху і тым разьбіць саюз: пагражаюць арыштамі, аглядываюць з ног да галавы, запісваюць да пастарункоў кніжкі, адбіраюць сяброўскую кніжку і г. д.

З ад'ездам сэкрэтара паліцыя і адміністрацыя яшчэ больш сталі чапляцца да работнікаў, запісаных да саюзу. Загадчык заводу зрабіў выгавар усім работнікам, што ён ніколі ня думаў, што работнікі дазволяць „гэткую паршывую працу сярод сябе“ і абвясьціў, што будзе вясьці барацьбу без пашчады, а на першы пачатак звальняе з тартаку некаторых сяброў камітэту саюза.

Паліцыя бадай што кожны дзень робіць „pobudki“ работнікаў у бараку, праверваюць дакумэнты, арыштоўваюць і робяць усякія іншыя „прыемнасьці“ не даючы работнікам аддыхнуць пасьля цяжкай працы. Цікава, што пасьля арганізацыі саюзу кожны дзень можна пабачыць пана камэнданта ці паліцыянта на гарбаце ці полудні ў адміністрацыі заводу. Як нам вядома законы Польскай Рэспублікі дазваляюць свабодна арганізоўвацца работнікам і зусім ня сьлед паліцыі мяшацца ня ў сваю справу. А можа наша Вішняўская паліцыя хоча йсьці па сьледам Лодзінскай, якая страляла ў работнікаў ў часе апошніх забастовак?

Работнік П.

Ад Рэдакцыі.

Рэдакцыя «В. С.» шле шчырае прывітаньне работнікам тартаку Жардэлі, якія выступілі на шлях арганізованага змаганьня за свае правы і жадае посьпеху ў змаганьні работнікаў з вызыскам буржуазіі за сьветлую будучыну працоўных масаў.

Кажан-Гарадок, Лунінецкага пав.

Бьюць, бьюць і бьюць. Які нумар ня возьмеш нашай беларускай газэты ў кождым знойдзеш, што там пабілі, там пакалацілі, а там забілі чалавека. Было і ў нас здарэньне, якое я і хачу вывясьці на сьвет. У нашай мясцовасьці ёсьць загад, калі колеш сьвіньню ці парася, рэжаш курыцу ці цялё,трэба даводзіць аб гэтым да ведама паліцэйскага пастэрунку. І вось-жа грам. Зіміч Рыгор не паслухаў гэтага загаду і цяпер сядзіць у вастрозі. Але перад тым, як пасадзіць паліцыя яго „пагладзіла“, але так пагладзіла, што ён будзе навет і па сьмерці помніць. Завязалі галаву, заткнулі рот і білі па чым толькі папала. Потым намачылі палатно пакрылі ім цела, каб не нарабіць сінякоў і зноў білі. Білі па пятам. Але і гэтага было мала. Сярэдня-вяковая інквізыцыя не дадумалася-б навет да гэтага. Вынялі penis і білі па ім бізунамі і пстрычкамі. Дык вось якое здарэньне было ў нас. Куды не павернешся таўкуць і бьюць. Хто-б да нас толькі ня прыйшоў усе таўкуць і бьюць, рабуюць і забіраюць. Само сабою навязваецца пытаньне. Хто-ж нас ня будзе біць? Хто і ў нас будзе бачыць людзей? Пры якой уладзе і мы будзем грамадзянамі сваей зямелькі? Тыя, хто яшчэ ня думалі над гэтым, няхай падумаюць.

Падарожны.

УСХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.

Беларусь на сельска-гасп. выстаўцы ў Маскве.

Як ступіў на тэрыторыю выстаўкі, дык вочы разьбягаюцца. Ня ведаеш, куды кінуцца. Хочацца зразу ўсюды глянуць.

Але перш-наперш цягне туды, дзе наша Беларусь.

Паглядзеў на плян—Беларусь пад № 94. Ну й пабег шукаць. Бачу балота, накопаны канаўкі, стаяць цікавыя машыны, ляжаць штабелі торфу.

Га! Ці ня тут дзе паблізу. Бо вельмі падобна да нашых краёў. А вунь і будыніна бяз ніякіх гмахаў; простая, але прыгожая, нешта як быццам роднае.

Падхожу бліжэй: Высока на шчыце літары.—

Беларусь.

Тут. Над пярэднім ганкам штучны, каляровы малюнак: дарога. Паабапал — буйныя зялёныя нівы. Здалёку відаць вёска. Па дарозе ідуць з сярпамі жанкі і з касамі хлапцы.

Захожу ў сярэдзіну. Кідаецца ў вочы наш беларускі стыль. Столь, сьцены, слуп вымаляваны як-бы паясочкамі, што нашы ка бéты для падвязак і пояскоў робяць.

Малюнкі нашых прыгожых кабет, сівы дзядоў нашых вёсак. Што датычыцца экспа натаў, выстаўленых на погляд, дык тут зной дзеш усё. Пачынаецца з нашай глебы, а да лей, што расьце ў нас: наша жытцо, ячмен пшаніца-зімка, яравая, грэчка, лубін, канюшы на і г. д.

Усё гэта такое прыгожае, вялікае...

Тут і з вёсак і з саўхозаў.

Над усім гэтым відаць сьвядомая рука працa нашага сельска-гаспадарчага інстытут

Далей ідзе наша прамысловасьць, дз найболей выдаецца праца прафшкол. Ян паказалі сваю работу—мэблю, сьлясарны і ста лярны струмэнт, мадэль паравой машын аптэчныя вагі і поўна іншага. Усё гэта та апрацована, што ў аглядаючых выстаўку част вырываюцца словы: „Ай як добра!“.

Далей ідзе наша сельскае жыцьцё. Пра ца нашых кабет у доўгія зімовыя вечар Тут і палатно, і сукны, і коўдры, гуньк ручнікі.

Гэтым усім вельмі цікавяцца аглядаючы

Трэба наогул сказаць, што ў кароткі газэтным нарысе нельга ўсяго расказаць. Д сыць таго, што хто паглядзіць наш павільё той атрымае поўны нарыс нашага беларуск га жыцьця.

У Няскучным садзе пяе наш хор па кіраўніцтвам Тэраўскага. Тут-жа на зьмен пяюць і ўкраінцы і вялікарусы.

Але як сьпяюць нашу „бульбу“, „ляв ніху“ ці што другое, дык публіка плешча крычыць „брава“ больш, як другім.

А дзед лірнік з сваімі хватаючымі з сэрца сьпевамі наганяе думкі і часамі выціскае з дзявочага вока сьлязу.

Нашу Беларусь і тут выявіла сваё на раўне з другімі, а можа і лепей.

М. Ф.

Рэдактар-Выдавец **Я. Лагіновіч.**
Друкарня **Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.